# Аб ролі вонкавага маўлення ў развіцці прафесіянальнай актыўнасці будучых настаўнікаў

Як і іншыя віды чалавечай дзейнасці, маўленне псіхалагічна арганізавана, г.зн. з аднаго боку, яно прадметна матываванае, мае эўрыстычны характар, а з другога — складаецца з некалькіх паслядоўных фаз (арыенціроўка, планаванне, рэалізацыя плана, кантроль). Вынікам маўленчай дзейнасці з'яўляецца тэкст (вусны ці пісьмовы). Маўленне і сам працэс (маўленчая дзейнасць) і яго вынік (тэкст) — матэрыяльнае, яно ўспрымаецца слыхам, зрокам, яно заўсёды запатрабавальнае пэўнай жыццёвай сітуацыяй, якая і вызначае выбар тых ці іншых моўных сродкаў. На жаль, у школе (і часта ў жыцці) выкарыстоўваецца уніфіцыраванае, пазбаўленае нацыянальных асаблівасцяў частка моўных сродкаў як беларускай, так і рускай моў, што прыводзіць да вельмі беднага і невыразнага маўлення не толькі вучняў, але і настаўнікаў.

Адна з асноўных адметных прымет маўлення — яго індывідуальны характар. Маўленне заўсёды належыць пэўнай асобе, якая выбірае, аддае перавагу тым ці іншым моўным сродкам. Выбар гэты залежыць ад псіхалагічнага стану чалавека, яго ўзросту, полу, адукацыі, прафесіі, ад камунікатыўнай задачы, адносін да субяседніка, эстэтычных і этычных ацэнак канкрэтнай сітуацыі. У залежнасці ад пастаўленай задачы вызначаецца інфарматыўнае, прэскрэптыўнае, экспрэсіўнае і інш. маўленне. Сам працэс маўлення характарызуецца індывідуальным тэмпам, тэмбравымі асаблівасцямі, артыкуляцыйнай выразнасцю, акцэнтам і інш.

Кожны выкладчык імкнецца не толькі даць студэнтам аб'ём ведаў па сваёй дысцыпліне, неабходны для прафесіянальнай дзейнасці, але і стараецца развіць у іх маўленчую актыўнасць. Фарміраванне комплексу ведаў з усіх дысцыплін адбываецца з улікам профілю прафесіянальнай падрыхтоўкі. Прафесіянальная "прывязка" уплывае і на прынцыпы пабудовы кожнага курса (у прыватнасці прынцып рэдыкцыянізму), і на структуру курса (што чытаць і ў якім аб'ёме), і на выбар формаў навучання.

Маўленчая актыўнасць студэнта педагагічнай ВНУ выяўляецца ва ўменні адказаць на пытанне, выступіць апанентам без папярэдняй падрыхтоўкі, апісаць анатацыю, рэцэнзію, пісьмо, рэферат, падрыхтаваць і выступіць з вусным паведамленнем і інш. Іншым словам, адной з асноўных задач навучання з'яўляецца развіццё вонкавага маўлення будучага настаўніка. Іменна вонкавае маўленне (у адрозненне ад унутранага) патрабуе паўнаты ў афармленні думкі, пабудовы дакладнага, выразнага, з разгорнутай думкай тэксту (вуснага ці пісьмовага). Унутранае маўленне прызначана толькі самому сабе, і чалавек разважае пра тое, што яму вядома, без захавання старых правілаў мовы, граматычнага афармлення тэксту, паколькі прадмет і дзеянне не называюцца, а толькі ўяўляюцца ў выглядзе вобраза-схемы. З-за гэтага ўзнікаюць сітуацыі, калі студэнт перакананы, што валодае матэрыялам, бо на ўзроўні ўнутранага маўлення

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

добра сам сябе разумее, але аформіць думку сваімі словамі не можа. Прычына — у разрыве паміж унутраным і вонкавым маўленнем (дарэчы, тэставая сістэма на ўступнай кампаніі толькі павялічвае гэты разрыў). Відавочна, унутранае маўленне — гэта толькі неабходны этап пераходу да разгортвання вонкавага маўлення. Афармленне думкі ў выглядзе вуснага ці пісьмовага тэксту патрабуе ад студэнта трывалых навыкаў вуснага і пісьмовага маўлення. Прычым вуснае маўленне можа суправаджацца жэстамі, мімікай. Паводле характару стварэння вуснае маўленне менш падрыхтавана, чым пісьмовае, у ім больш стыхійнага, выпадковага, могуць быць паўторы, агаворкі, таму задача развіцця прафесіянальнага вуснага маўлення і прафесіянальнай актыўнасці будучых настаўнікаў адна з найбольш важных пры выкладанні лінгвістычных дысцыплін.

На занятках па "Уводзінах ў мовазнаўства", "Гісторыі беларускага мовазнаўства", "Беларускай мове", "Сучаснай беларускай мове" і інш. мэтазгодна праводзіць круглыя сталы па актуальных праблемах агульнага, усходнеславянскага і беларускага мовазаўства, дзе для кожнага ўдзельніка з'яўляецца магчымасць выказаць свае меркаванні. Студэнт павінен умець даць дакладнае азначэнне асноўных паняццяў па кожным раздзеле мовазнаўства (для гэтага на практычных занятках можна праводзіць франтальнае апытванне), выступіць з дакладам, адказаць на пытанні па тэме даклада, прадэманстраваць бездакорнае прафесіянальнае маўленне. Карысна кожнае вуснае паведамленне абмеркаваць у групе, прычым павінны выступіць не толькі прызначаныя загадзя апаненты, але і ўсе студэнты ў аўдыторыі.

У сваіх выступленнях яны адзначаюць станоўчыя бакі даклада, уменне дакладчыка трымацца перад аўдыторыяй, яго здольнасць працаваць з аўдыторыяй, выклікаць цікавасць да зместу даклада, а таксама выказваюць свае заўвагі і пажаданні, называюць выпадкі нарушэння моўных нормаў у маўленні дакладчыка.

Часцей за ўсё, прычына памылак у маўленні студэнтаў — міжмоўная інтэрвенцыя. Адным са шляхоў папярэджання такіх памылак у маўленні студэнтаў з'яўляецца супастаўляльны аналіз моўных з'яў ва ўсходнеславянскіх мовах, акцэнціраванне ўвагі на нацыянальных асаблівасцях кожнай з моў, што дазволіць пазбегнуць міжмоўнай інтэрферэнцыі, убачыць, у якіх выпадках яна падтрымліваецца ўнутрымоўнай, і падрыхтаваць адпаведныя заданні. Само выкананне заданняў і дасць пэўныя веды і ўменні студэнтам, дапаможа развіць іх маўленне, узбагаціць іх лексічны і граматычны запас, удасканаліць культуру маўлення, павысіць сваю прафесіянальную актыўнасць. Развітая маўленчая актыўнасць з'яўляецца неабходнай умовай для развіцця прафесіянальнай актыўнасці настаўніка.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ